# Секцыя 6

**А. І. Бабко,**
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*

## ДЫЯЛАГІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ЯК СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ Ў СТУДЭНТАЎ САЦЫЯЛЬНЫХ І КАГНІТЫЎНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дыялагізм быў заўжды характэрны для сферы адукацыі. Іншае пытанне, наколькі поўна і паслядоўна здзяйсняліся і здзяйсняюцца ў ёй дыялагічныя прынцыпы, метады і арганізацыйныя формы, наколькі адпавядалі і адпавядаюць рэальныя дыялагічныя стасункі, што мелі і маюць месца ў адукацыйным працэсе, ідэалу плённага, змястоўнага, творчага дыялогу. Ідэал выяўляе дыялектычную натуру: ён здзяйсняецца (інакш ён уяўляў бы сабой не ідэал, а пусты гук) і разам з тым увесь час адрознівае сябе ад рэчаіснасці, аддаляецца ад яе (у іншым выпадку ён таксама не быў бы ідэалам, згубіў бы сваё прызначэнне – быць поклічам з будучыні, штурхаць, рухаць наперад). Рэалізацыя высокага дыялагічнага ідэалу ў адукацыйным працэсе таксама мае супярэчлівы характар, і таму правамерна сцвярджаць, што ў гэтым абсягу грамадскага жыцця адчуваецца і заўжды будзе адчувацца патрэба ў пашырэнні і ўдасканаленні неад'емна прысутных у ім дыялагічных арганізацыйных форм, стасункаў, мадэляў паводзін.

Актуальнасць і важнасць дыялагізацыі адукацыйнай сферы абумоўлена эфектыўнасцю крэатыўнага, даследчага дыялогу ў плане дасягнення тых мэт і вырашэння тых задач, што перад дадзенай сферай ставяцца. Істотнае значэнне належыць яму і ў кантэксце забеспячэння практычнай арыентацыі адукацыйнага працэсу, у кантэксце фарміравання ў студэнтаў разнастайных кампетэнцый – у першую чаргу сацыяльных і кагнітыўных. Відавочна, што яны маюць грунтоўны дыялагічны элемент: калі адсутнічае здольнасць весці творчы дыялог, нельга ўвогуле гаварыць пра наяўнасць кампетэнцый. З іншага боку, праз агульны камунікатыўны кампанент абодвух комплексаў кампе-

тэнцый выяўляецца іх глыбокая ўзаемасувязь, якая грунтуецца на тым, што дыялог выступае як сацыяльна арганізаваная пазнавальная дзея і ў сваіх праўдзівых формах гарманічна спалучае сацыяльны і кагнітыўны аспекты. Таму праз творчае і паслядоўнае здзяйсненне дыялагічных прынцыпаў у сферы адукацыі сацыяльныя і кагнітыўныя кампетэнцыі студэнтаў фарміруюцца адначасова і ў арганічным адзінстве.

Неабходна адзначыць, што найважнейшай умовай дыялагізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляецца падрыхтаванасць яго ўдзельнікаў да дыялагічных стасункаў і іх скіраванасць на адпаведныя мадэлі паводзін. Аднак згаданыя здольнасці і якасці не могуць быць набытыя па-за межамі дыялагічных узаемадачыненняў. У сувязі з гэтым можа ўзнікнуць уражанне, што тут мае месца «заганнае кола»: перадумовай дыялагізацыі з'яўляецца здольнасць весці плённы дыялог, якую нельга сфарміраваць без дыялагізацыі адпаведнай сферы дзейнасці. Дадзенае ўражанне, нягледзячы на знешнюю абгрунтаванасць, мае тым не менш памылковы характар. Сапраўды, і выкладчыкі, і студэнты, і іншыя ўдзельнікі адукацыйнага працэсу, відавочна, зусім не пазбаўлены ўсякага дыялагічнага досведу, яны валодаюць пэўнымі навыкамі і ўменнямі ў плане вядзення дыялогу, якія могуць (і павінны) выступаць як аснова для далейшага, усё больш поўнага і паслядоўнага здзяйснення камунікатыўных прынцыпаў у адпаведных практыках.

У сувязі з гэтым паўстае важнае пытанне пра шляхі, метады і механізмы пашырэння і ўдасканалення дыялагічных форм функцыянавання адукацыйнай сферы. Да найбольш дзейсных сродкаў у гэтым плане належыць стварэнне дыялагічных сітуацый. Дыялагічнай сітуацыяй з'яўляецца і такі выпадак, калі ўсе ўдзельнікі дыялогу адчуваюць унутраную патрэбу ўвайсці і ўглыбіцца ў дыялагічныя стасункі, адчуваюць немагчымасць застацца ў баку ад іх. Што можа зрабіць выкладчык для стварэння такой сітуацыі? У кантэксце выкладання філасофскіх дысцыплін (але не толькі іх) неабходна адзначыць наяўнасць у іх змястоўным абсягу надзвычай дыскусійных і актуальных тэм, праблем і пытанняў, якія нікога не пакідаюць абыякавым і горача абмяркоўваюцца ў грамадстве – у СМІ, на бытавым узроўні і г. д. Пры іх разглядзе не патрэбна шмат намаганняў для таго, каб завязалася дыскусія. Істотныя высілкі (і майстэрства) выкладчыка патрэбны ў дадзеным выпадку, ад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нак для прадухілення дэградацыі дыялогу дыскусія не павінна ператварацца ў спрэчку, усплёск эмоцый не павінен выштурхоўваць на задні план аргументы, месца якіх могуць заняць абразы і г. д.

Дзейсным інструментам стварэння дыялагічнай, камунікатыўнай, інтэрактыўнай атмасферы ў адукацыйнай прасторы з'яўляецца таксама мадэляванне парадаксальных пазнавальных сітуацый. У філасофскім кантэксце парадокс – гэта невыпадковая супярэчнасць, якая ўпарта, зацята супраціўляецца вырашэнню. Ашаламляльны эфект дадзенага феномена [3, с. 1054, 1056], яго нетрывіяльнасць павінны, безумоўна, выклікаць у тых, хто з ім сутыкаецца, патрэбу абмеркаваць яго, выказаць свае думкі, пачуцці, прапановы адносна яго вырашэння. Парадаксальная пазнавальная сітуацыя мае, такім чынам, грунтоўны дыялагічны патэнцыял і з лёгкасцю ператвараецца ў сітуацыю дыялагічную.

Агульнавядома, што дыялог можа быць плённым толькі пры ўмове раўнапраўя яго ўдзельнікаў. Аднак выкладчык, як правіла, пераўзыходзіць студэнтаў у ведах, досведзе і г. д. Ці магчыма ў такім выпадку выканаць згаданае патрабаванне ў рамках адукацыйнага працэсу? Адказ на дадзенае пытанне павінен даць і дае выкладчык, і ва ўласных інтарэсах кожнага выкладчыка – узняцца да сцвярджальнага адказу на яго, гэта значыць зноў і зноў імкнуцца да стварэння такой атмасферы ў зносінах са студэнтамі, у якой яны будуць адчуваць запатрабаванасць іх думкі, іх пазіцыі. Няма неабходнасці ў вульгарызацыі сваіх поглядаў ці апусканні на больш нізкі ўзровень ведаў – зусім наадварот! Ад выкладчыка патрабуецца толькі выбудоўваць дыялог з маладымі людзьмі такім чынам, каб ім сапраўды было цікава і зразумела. Дзеля гэтага нам варта памятаць, аднак, і пра той інтэлектуальны ўрок, што вынес з грунтоўнага, глыбокага вывучэння дыялогаў Платона выбітны нямецкі філосаф Г.-Г. Гадамер: каб дасягнуць сапраўднага разумення пэўнай думкі, падзеі ці феномена, каб адкрыць сябе для яго, неабходна ставіць пад пытанне і адпаведны змест, і самога сябе [1]. Не менш карысна ў дадзеным кантэксце было б таксама мець на ўвазе здзеклівую рэпліку К. Р. Попера на адрас тых філосафаў, што абіраюць у якасці суразмоўцаў саміх сябе і ганарацца гэтым: «Бог – тут няма месца для сумненняў – размаўляе пераважна з самім сабой, бо ніхто не варты весці дыялог з ім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філосаф, аднак, павінен быў бы ведаць, што ён ніяк не больш богападобны, чым усякі іншы чалавек» [2, с. XVI]. – (Пераклад мой. – *А. Б.*).

Такім чынам, дыялагізацыя адукацыйнага працэсу выступае як надзвычай дзейсны спосаб актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх адпаведных кампетэнцый. Не ў меньшай ступені гэта датычыць і іх падрыхтаванасці да жыцця і дзейнасці ў грамадстве ў рамках пэўных грамадскіх структур. Відавочна, што здзяйсненне дыялагічных прынцыпаў у сферы адукацыі можа адбывацца рознымі шляхамі, і можна спадзявацца, што рэальнае разгортванне адпаведных практык выявіць новыя эфектыўныя і цікавыя спосабы іх арганізацыі, а таксама дазволіць удасканаліць тыя, што былі разгледжаны вышэй.

---


1. *Malpas, J.* Hans-Georg Gadamer [Electronic resourse] / J. Malpas // The Stanford Encyclopedia of Philosophy ; Edward N. Zalta (ed.). – Mode of access : http://plato.stanford.edu/archivs/sum2015/entries/gadamer/. – Date access : 04.07.2015.

2. *Popper, K. R.* Logik der Forschung / K. R. Popper. – 10. Aufl. – Tübingen : J.C.B. Mohr (Paul Siebeck), 1994. – XXIX, 481 s.

3. *Schäfer, K.* Paradox / K. Schäfer // Handbuch philosophischer Grundbegriffe / hrsg. von H. Krings, H.-M. Baumgarten, C. Wild : in 6 B. – München : Kösel-Verlag, 1974. – Bd. 4. – S. 1051–1059.



**У. Ф. Красюк,**
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*


# МАРАЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ З ПАЗІЦЫІ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ

Далучэнне Беларусі да Балонскага працэсу ставіць пытанне аб кампетэнтнасным падыходзе як сродку ўдасканалення сістэмы адукацыі і падрыхтоўкі якасных спецыялістаў. Згодна з пастаўленай задачай будучы спецыяліст павінен быць усебакова падрыхтаваным да жыцця. Гэта значыць, не толькі валодаць назапашанымі ведамі, але і ўмець ставіць перад сабой мэты, рабіць самастойны выбар, вырашаць праблемы, несці адказнасць за іх вырашэнне. У сучасным няўстойлівым свеце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ